■ Кропкі над «і»

# КАЛІ ПРАВЕРКА — НЯПРАВІЛЬНАЯ

### Нашы прадпрыемствы пакутуюць ад памылак суседскіх кантралёраў

**Неадпаведнасці ў беларускай прадукцыі, што выяўляюцца, — прамое следства парушэнняў «Рассельгаснагляду» пры адборы проб. Пра гэта заявіў БЕЛТА начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Мінсельгасхарча Аляксей БАГДАНАЎ.**

Ён растлумачыў, што перыяд ад адбору проб прадукцыі да правядзення даследавання рэгламентаваны адпаведнымі нарматывамі, якія «Рассельгаснагляд» ігнаруе. «Мы па пратаколах «Рассельгаснагляду» бачым, што ад адбору проб да дастаўкі іх у лабараторыі праходзіць ад 3 да 11 дзён. Хоць на дастаўку проб мяса астуджанай курыцы да лабараторыі, напрыклад, павінна адводзіцца 6 гадзін. А ў цэлым тэрмін прыдатнасці для рэалізацыі астуджанага мяса птушак складае 5 сутак. Таму пры такіх парушэннях ва ўжо сапсаваных спецыялістамі «Рассельгаснагляду» пробах можна не толькі лістэр знайсці, але і ўсё, што пажадаеце», — абурыўся прадстаўнік Мінсельгасхарча.

Аляксей Багданаў нагадаў, што заканадаўства ЕАЭС прадугледжвае правядзенне адбору проб на прадпрыемствах-вытворцах альбо ў пункце выгрузкі тавару. «Але ні ў якім разе не пры перавозцы або ў пунктах продажу тавараў. Таму што ў такіх выпадках вытворца адказнасці за тавар не нясе — ён не ведае пра ўмовы перавозкі, захоўвання прадуктаў», — сказаў Аляксей Багданаў. У гэтай сувязі начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці Мінсельгасхарча асабліва падкрэсліў, што менавіта парушэнні рэгламентаў пры працэдурах адбору проб беларускай прадукцыі, захоўвання і транспарціроўкі проб прадстаўнікамі «Рассельгаснагляду» прыводзяць да таго, што яны знаходзяць у беларускіх прадуктах якія-небудзь неадпаведнасці.

Прадстаўнік Мінсельгасхарча пракаментаваў сітуацыю з закрыццём некаторых беларускіх прадпрыемстваў. Прычына таму — падробкі беларускай прадукцыі на расійскім рынку, адносін да якіх нашы кампаніі не маюць. «На расійскім рынку вельмі шмат парушэнняў з пункту гледжання фальсіфікату. Напрыклад, у рэгіёнах Расіі на складзе або паліцы крамы бярэцца проба прадукцыі аднаго з беларускіх малочных заводаў. Выяўляецца нібыта неадпаведнасць па тлушчавым або бялковым балансе, па іншых параметрах. Потым выстаўляецца прэтэнзія з боку Расіі, і беларускае прадпрыемства закрываецца. Пры правядзенні разбору аказваецца, што прадукцыя — фальсіфікат: выраблена ў Расіі на падпольным заводзе пад маркай «Зроблена ў Беларусі». Абсалютна невінаватае беларускае прадпрыемства закрываецца «Рассельгаснаглядам». Прычым тут Беларусь, наогул незразумела!» — заўважыў Аляксей Багданаў, назваўшы пазіцыю «Рассельгаснагляду» прадузятай у адносінах да беларускіх прадуктаў харчавання. Пры гэтым ён падкрэсліў: «Мы не супраць кантролю, але давайце гэта рабіць у рамках рэгламентаў і законаў, якія мы разам прымалі на агульнай пляцоўцы ЕАЭС».

У цэлым адносна аб'ёму экспарту прадукцыі арганізацый Мінсельгасхарча начальнік галоўнага ўпраўлення знешнеэканамічнай дзейнасці ведамства інфармаваў, што за 10 месяцаў гэтага года ён склаў $1 млрд 866 млн — 98,5% да ўзроўню аналагічнага перыяду мінулага года. Пры гэтым у агульным аб'ёме экспарту на долю паставак у Расію прыпадае 94%. У студзені—кастрычніку ў расійскія рэгіёны адгружана прадукцыі на суму $1 млрд 764 млн (98,9% да ўзроўню студзеня—кастрычніка 2015 года). Экспарт мяса птушкі ў натуральным выражэнні ў студзені—кастрычніку павялічыўся на 7,6%, каўбасных вырабаў — на 65%, вырабаў з мяса — на 26%, сыроў і тварагу — на 16,2%, сухой сыроваткі і канцэнтратаў — на 11%, мукі — у 4 разы.

«Па прагнозах, тэмп росту аб'ёму экспарту па выніках года складзе не менш за 100% да ўзроўню мінулага года», — адзначыў суразмоўца, удакладніўшы пры гэтым, што, нягледзячы на высокі рост аб'ёмаў паставак у натуральным выражэнні, адзначаецца нізкі ўзровень коштаў да ўзроўню мінулага года. Аляксей Багданаў таксама сказаў, што Мінсельгасхарч актыўна працуе над дыверсіфікацыяй беларускага экспарту: у студзені—кастрычніку гэтага года арганізацыі ведамства пастаўлялі прадукцыю на рынкі 58 краін свету супраць 51 краіны за аналагічны леташні перыяд.

■ Падпіска-2017

## Час цёплых сустрэч на Міншчыне

Зіма ўступіла ў свае правы, але гэта зусім не перашкода для нашых сустрэч з чытачамі.

Звяздоўцы ўжо пабачыліся з падпісчыкамі газеты ў самых розных кутках Беларусі.

Мы аб'ехалі ўсе вобласці, правялі сустрэчы ў сталіцы. І ўсюды пераконваліся: «Звязду» любяць, чытаюць і чакаюць. Зразумела, такі чалавечы фармат і нас у сваю чаргу належным чынам абавязвае. Перш за ўсё — штодня ствараць родную газету на роднай мове. І па магчымасці як мага часцей сустракацца з тымі людзьмі, дзеля якіх, уласна, і працуем. Бо газета без зваротнай сувязі — проста стос паперы.

Таму гэтымі прыгожымі снежаньскімі днямі вырашана правесці глабальны Дзень падпісчыка «Звязды»: мы завітаем на Міншчыну — адразу ў тры раёны. Такім чынам, **16 снежня Дзень падпісчыка адбудзецца: на Стаўбцоўскім раённым вузле паштовай сувязі (РВПС) — з 10 да 13 гадзін, Лагойскім РВПС — з 11 да 14 гадзін, на Клецкім РВПС — з 12 да 15 гадзін.**

Па добрай завядзёнцы кожны, хто падпішацца, атрымае адметны звяздоўскі падарунак.

**Прыходзьце — сумаваць не давядзецца!**

# МІНЧАНЕ ШУКАЮЦЬ РАБОТУ ДАЎЖЭЙ ЗА ЎСІХ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Актыўна шукаюць прадаўцоў — 1,1 тысячы вакансій. Большасць прапаноў у рэгіёнах: работнікі за касай патрэбны ў Добрушы, Наваполацку, Пружанах, Рагачове, Капылі. Амаль столькі ж свабодных месцаў налічваецца для кіроўцаў. Плацяць, праўда, нямнога — толькі пятая частка наймальнікаў прапануе 600 рублёў у месяц і больш: 650 рублёў абяцаюць кіроўцу ў Краснапольскім лягасе, 900 — у мінскім аўтобусным парку №4.

Нечакана сярод запатрабаваных прафесій аказаліся прыбіральшчыкі памяшканняў (апошнія два гады такія вакансіі былі ў дэфіцыце). Прапануюць — паўтысячы, грошай — у асноўным да 300 рублёў у месяц.

Саіскальнікаў жа часцей цікавяць месцы эканаміста, бухгалтара, інжынера і сакратара.

Як паведамляюць у Міністэрстве працы і сацабароны, усяго з пачатку года пры садзейнічанні службы занятасці ўладкавана на пастаянную работу 150 тысяч чалавек, з іх 101 тысяча беспрацоўных. На вучобу па запатрабаваных прафесіях накіравалі каля 11 тысяч грамадзян. 144 сям'і перасяліліся на новае месца жыхарства і працы. Яшчэ 1,6 тысячы беспрацоўных атрымалі субсідыі на арганізацыю прадпрымальніцтва, рамесніцтва, дзейнасці ў сферы аграэкатурызму.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
lubneuskaya@zviazda.by

# НУМАР ПЕРШЫ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

— Прыемна напярэдадні Новага года і Раства здаваць у эксплуатацыю такі вельмі важны сацыяльны аб'ект, — адзначыў **старшыня Магілёўскага аблвыканкама Уладзімір ДАМАНЕЎСКІ.** — Гэты дом незвычайны тым, што пабудаваны па новых тэхналогіях. Я мяркую, што жыхары ўжо праз год адчуюць усе перавагі жыцця ў ім. Разам з імі будзем ацэньваць эфектыўнасць абсталявання. У далейшым будзем прымяняць такую тэхналогію на іншых аб'ектах жыллёвага будавання Магілёўскай вобласці.

Пасля ўрачыстай цырымоніі адкрыцця і перарэзання чырвонай стужкі жыхары мелі магчымасць ацаніць сваё будучае жыллё, праўда, пакуль умоўна. Бо лёсаванне і ўручэнне ключоў ад кватэр яшчэ наперадзе. Пакуль сімвалічны ключ атрымалі Марына Варанцова і Павел Свішчанкоў, якія выхоўваюць траіх дзяцей. Сям'я атрымала ў новым доме трохпакаёўку. Свае эмоцыі Павел і Марына выказалі адным словам: «Крута!» Тры гады стаялі на чарзе і тут такое шчасце.

— Гэты дом — першы ў Беларусі энергаэфектыўны другога пакалення, які быў спраектаваны спецыялістамі і пабудаваны ў Беларусі пры падтрымцы праграмы ААН і Глабальнага экалагічнага фонду. Праграма развіцця ААН уклала ў яго мільён долараў, — паведаміла **Кацярына ПАНІКЛАВА, намеснік пастаяннага прадстаўніка ПРААН у Беларусі.** — Акрамя таго, у доме ёсць сонечныя панелі і цеплавыя вузлы, якія ўсталяваны ў доме, не простыя. Нават сцёкавыя воды, якія ўтвараюцца тут, будуць выкарыстоўвацца для цяпла. Галоўная мэта — знізіць спажыванне энергіі ў два разы і абмежаваць выкіды парніковага газу, які ўплывае на змяненне клімату. У гэтым доме будзе расці новае пакаленне беларусаў, для якіх такі эканамічны падыход стане прыкладам у жыцці. Беларусь 15 гадоў таму прыняла новыя энергаэфектыўныя стандарты, чым вельмі выгадна стала адрозніваецца ад іншых краін на постсавецкай прасторы.

Унутры дома ўсё прадумана да дробязяў. Нават ёсць спецыяльныя замкі на вокнах, якія не дадуць выпасці дзіцяці. А галоўнае, сем'і змогуць значна эканоміць. «Штомесячныя камунальныя выплаты будуць такія ж, як у любым іншым доме, але ў тры разы меншыя за цяпло, — удакладняе **Аляксандр ГРАБЯНЬКОЎ, кіраўнік праекта ПРААН і Глабальнага экалагічнага фонду па павышэнні энергаэфектыўнасці жылых будынкаў.** — Абслугоўваннем дома зоймецца звычайная жыллёва-эксплуатацыйная арганізацыя. На працягу паўтара года будзем вучыць спецыялістаў, як працаваць. Тая сістэма, якая тут усталявана, не складаная. Галоўнае, каб ніхто не спрабаваў парушыць яе. Будзем тлумачыць жыхарам, наколькі гэта важна».

Наперадзе яшчэ канчатковая аздоба кватэр. Але людзі шчаслівыя. «Гэты дом найлепшы, — падзялілася адна шматдзетная маці. — Да таго ж блізка дзіцячы садок, школа, крамы таксама. Усё проста супер!» Самі кватэры невялікія, але тыя сем'і, якім трэба большая плошча, зоймуць адначасова дзве. Гэта вельмі зручна.

Будаўнікі таксама задаволены.

— Улічваючы, што гэта першы дом, а камунікацыі ў ім маюць свае асаблівасці, то адпаведна іх мантаж і ўсталяванне былі для нас першым досведам, — прызнаўся **начальнік гарадскога ўпраўлення камунальнага будаўніцтва Андрэй МАСКАЛЁЎ.** — Але ўсе пытанні, якія ўзнікалі па праекце, вырашаліся ў ходзе будаўніцтва. Дом унікальны. На яго даху размешчана 320 квадратных метраў сонечных батарэй. Яны будуць назапашваць і ператвараць сонечную энергію ў цеплавую і падаграваць ваду.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**
zigulya@zviazda.by

■ Віншуем!

# АДЗНАЧАНЫ СПАРТЫЎНЫЯ ТАЛЕНТЫ

### Цырымонія ўручэння пасведчанняў стыпендыятаў Прэзідэнцкага спартыўнага клуба прайшла ў Зале алімпійскай славы НАК

Ужо больш за дзесяць гадоў Прэзідэнцкі спартыўны клуб падтрымлівае маладых, перспектыўных атлетаў і трэнераў краіны. На гэты раз у лік абраных трапілі найлепшыя прадстаўнікі трыццаці трох відаў спорту. У 2016 годзе яны занялі высокія месцы на найбуйнейшых міжнародных спаборніцтвах: з 182 спартсменаў-стыпендыятаў 158 падымаліся на п'едэстал, астатнія трапілі ў васьмёрку наймацнейшых. Пераможцамі сусветных і еўрапейскіх першынстваў сталі 36 спартсменаў. Сярод іх біятланістка Дар'я Блашко, канькабежац Ігнат Галавацюк, легкаатлетка Эльвіра Герман, тэнісістка Вера Лапко, дзюдаіст Дзмітрый Мінькоў і іншыя. Акрамя таго, стыпендыятамі Прэзідэнцкага спартыўнага клуба сталі 28 трэнераў-выкладчыкаў.

*— Некаторыя з удзельнікаў гэтага праекта ўжо прайшлі шлях ад юніёра, які толькі падае надзеі, да атлета, уключанага ў Залу алімпійскай славы беларускага спорту. Шматлікія прызёры Алімпіяды 2016 года ў Рыа ў розны час з'яўляліся стыпендыятамі клуба, а ў складзе ўсёй беларускай дэлегацыі іх колькасць упершыню дасягнула 66%,* — адзначыў **старшыня цэнтральнага савета Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый ЛУКАШЭНКА.**



Фота БЕЛТА.

**Старшыня цэнтральнага савета Прэзідэнцкага спартыўнага клуба Дзмітрый ЛУКАШЭНКА ўручае пасведчанне Паліне КАЦЭВІЧ (акадэмічнае веславанне).**

Маладых спартсменаў з уручэннем іменных стыпендый павіншавалі таксама першы віцэ-прэзідэнт НАК, памочнік Прэзідэнта Беларусі па пытаннях фізічнай культуры, спорту і развіцця турызму Максім Рыжанкоў, першы намеснік міністра спорту і турызму Аляксандр Гагіеў, а таксама алімпійская чэмпіёнка па мастацкай гімнастыцы Марына Лобач.

Самая высокая стыпендыя ў 2017 годзе складзе 18240 беларускіх рублёў у год (з улікам 20% надбаўкі за прагрэс). Мінімальная прызначаная стыпендыя — 1896 рублёў у год.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
*lobazhevich@zviazda.by*

# Мы паедзем-паімчымся... у самы Новы год!

**Навагоднія святкаванні для 70 выхаванцаў дзіцячых дамоў сямейнага тыпу пачаліся з катання на алені, якога прывёз заапарк «Сірын» пад самыя дзверы тэатра-караоке «Багема», што ў Мінску.**



Фота Надзеі БУЖАН.

Учора тут стартавала рэспубліканская дабрачынная акцыя «Нашы сэрцы — дзецям», якая праходзіць у межах акцыі «Нашы дзеці» і якую вось ужо 25 гадоў запар арганізуе Беларускі дзіцячы фонд.

Кіраўнік творчай майстэрні «Трыумф-арт» Марына Куцко падрыхтавала творчую частку дабрачыннай навагодняй праграмы. А яшчэ былі конкурсы, мыльныя бурбалкі, карагоды з трохметровай пандай і майстар-класы валанцёраў Белдзяржуніверсітэта культуры і мастацтваў.

Акцыя працягнецца да 10 студзеня ва ўсіх абласцях і раёнах, а ў сталіцы Дзіцячы фонд разам з артыстамі і валанцёрамі наведае дзіцячыя аддзяленні бальніц: 22 снежня — РНПЦ псіхічнага здароўя, 26-га — дзіцячае апёкавае гарадской клінічнай бальніцы хуткай меддапамогі, 27-га — дзіцячае траўматалагічнае 6-й бальніцы, 28-га — Рэспубліканскі дзіцячы кардыялагічны цэнтр і іншыя.

Акцыю падтрымалі вядомыя дзяржаўныя і прыватныя прадпрыемствы, сярод якіх «Цэптар Інтэрнацыянал», «Кока-Кола Беўрыджыз Беларусь», «Чырвоны харчавік», «Чырвоны мазыранін», ЦУМ.

**Святлана БАРЫСЕНКА.** *protas@zviazda.by*